ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 28 (1064) ● Чацвер, 10 кастрычніка 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

● СВЯТА ШЧЫРЫХ СЯБРОЎ ● СТАРОНКА ПЕРШАКУРСНІКА ● КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ ● ДА 160-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. Ю. ЛЕРМАНТАВА ● АХОВА ПРЫРОДЫ

# ПРАГРАМА РАБОТЫ ВЫЗНАЧАНА

ПАБУДАВАЎШЫ развітае сацыялістычнае грамадства, наша краіна ўпэўнена ідзе па шляху да камунізму. Але гэты працэс шматгранны. Ён прадугледжвае не толькі ўсямернае развіццё грамадскай вытворчасці, стварэнне трывалай матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму і фарміраванне камуністычных грамадскіх адносін, але і выхаванне новага чалавека — будаўніка камунізму. Важнейшым элементам гэтага выхавання з'яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія б адпавядалі сучасным запатрабаванням навукова-тэхнічнага прагрэсу, фарміраванне ў іх навуковага марксісцка-ленінскага светапогляду, камуністычнай перакананасці.

Наша партыя праяўляе вялікі клопат аб развіцці вышэйшай адукацыі ў краіне, аб падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры, адданых савецкаму народу і справе камунізму. Новым важным клопатам у гэтым напрамку з'явілася пастанова ЦК КПСС «Аб рабоце ў Масковскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы імя М. Э. Баўмана і Саратаўскім дзяржаўным універсітэце імя М. Г. Чарнышэўскага па павышэнню ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладання грамадскіх навук». У гэтым дакуменце шматбакова прааналізаваны нашы дасягненні і глыбока выкрыты істотныя недахопы і ўпушчэнні ў выкладанні, намечаны асноўныя шляхі і напрамкі далейшага паляпшэння марксісцка-ленінскай адукацыі і камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі. З гэтай мэтай, пачынаючы з 1974-75 навучальнага года, будзе ажыццяўляцца бесперапыннае выкладанне грамадскіх навук на працягу ўсяго перыяду навучання і ўводзіцца адзіны дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму ва ўсіх вышэйшых навучальных установах краіны.

Кафедра навуковага камунізму, як і іншыя кафедры грамадскіх навук нашага універсітэта, успрыняла пастанову ЦК КПСС як праграму дзеяння і распрацавала канкрэтныя мерапрыемствы па яе практычнаму ажыццяўленню. Пры гэтым у цэнтры мы ставім задачы далейшага павышэння ідэйна-тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню выкладання навуковага камунізму, актывізацыю навукова-даследчай і самастойнай работы студэнтаў над першакрыніцамі, пры падрыхтоўцы да лекцый і семінарскіх заняткаў, фарміраванне ў іх камуністычных поглядаў.

Непасрэдна рэалізуючы гэту праграму, кафедра будуе сваю работу па чатырох асноўных напрамках. Перш за ўсё, зыходзячы з ленінскага ўказання аб тым, што ідэйна-палітычны напрамак лекцый, іх змест вызначаюцца цалкам і выключна саставам лектараў, прадугледжваецца далейшае ўдасканаленне работы з кадрамі выкладчыкаў, павышэнне іх навукова-метадычнай кваліфікацыі і педагагічнага майстэрства. Кожны год падрыхтоўку праз ІПК, стажыроўку і іншыя формы павышэння кваліфікацыі будзе праходзіць не менш 20 працэнтаў штатнага саставу выкладчыкаў. У гэтым навучальным годзе толькі ў ІПК будзе паслана не менш чатырох чалавек. Акрамя таго, плануецца да сакавіка 1975 года распрацаваць і строга выконваць план павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў на перыяд 1976—1980 гг. На пасяджэннях кафедры будзе сістэматычна разглядацца ход работы нашых выкладчыкаў над кандыдацкімі і доктарскімі дысертацыямі.

Але павышэнне кваліфікацыі — толькі адна з умоў далейшага пад'ёму ідэйна-палітычнага ўзроўню лекцый і семінарскіх заняткаў. Другой, не менш важнай умовай гэтага працэсу, з'яўляецца паляпшэнне ўсёй вучэбна-метадычнай работы са студэнтамі. З гэтай мэтай прадугледжваецца пастаяннае абнаўленне тэкстаў лекцый па тых ці іншых раздзелах курса навуковага камунізму з шырокім прыцягненнем партыйных і савецкіх дакументаў, матэрыялаў міжнароднага рабочага руху. Плануецца перыядычнае наведванне адкрытых лекцый выкладчыкаў, а таксама больш раўнамернае ўзаемнае наведванне лекцыйных і семінарскіх заняткаў.

У гэтым навучальным годзе будуць падрыхтаваны і абмеркаваны на пасяджэннях кафедры тэксты шасці вучэбных лекцый і арганізавана наведванне васьмі адкрытых лекцый. Усяго кожны выкладчык наведае на працягу года не менш двух заняткаў па кожнай форме навучання, у тым ліку прыкладна 30—40 працэнтаў семінарскіх заняткаў. Адначасова будзе весціся распрацоўка і перыядычнае абмеркаванне методыкі чытання лекцый і правядзення семінарскіх заняткаў, выкарыстання ў вучэбным працэсе мастацкай літаратуры і тэхнічных сродкаў навучання.

Паралельна з гэтым нашы мерапрыемствы акцэнтуюць увагу на неабходнасці пастаяннай актывізацыі самастойнай работы студэнтаў. На кафедры адкарэкціраван абавязковы мінімум першакрыніц і літаратуры па курсу навуковага камунізму для самастойнага вывучэння.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

## НАВІНЫ

У камітэце камсамола адбылася ўрачыстая сустрэча — сход прадстаўнікоў зямляцтваў замежных студэнтаў, якія займаюцца ў БДУ. Яна была прысвечана 25-годдзю ГДР.

* * *

**«Наш сябар — Іенскі універсітэт» — так называецца фотавыстаўка на трэцім паверсе галоўнага корпуса.**

**На фотаздымках адлюстравана гісторыя буйнейшай навучальнай установы ГДР, яе сённяшні дзень, развіццё сяброўскіх адносін з БДУ. Адзін з фотаздымкаў захаваў момант падпісання ў кастрычніку 1967 года ў Іене дагавору аб супрацоўніцтве паміж Іенскім універсітэтам імя Ф. Шылера і нашым універсітэтам.**

* * *

**Добрай традыцыяй на геаграфічным факультэце сталі выпускі фотахронікі студэнцкага жыцця. Пра экспедыцыю лімнолагаў, практыку на геабазе «Заходняя Беразіна», будні студэнцкіх будаўнічых атрадаў і, нарэшце, аб удзеле студэнтаў у сельскагаспадарчых работах расказваюць апошнія, восьмы і дзевяты, выпускі фотахронікі.**

* * *

Першае ў гэтым навучальным годзе пасяджанне камітэта камсамола фізічнага факультэта было прысвечана пытанням арганізацыі падпіскі на газеты і часопісы і падрыхтоўцы да справаздачна - выбарнай камсамольскай канферэнцыі факультэта.

# Віншуем лаўрэатаў!

Разгледзеўшы прапановы камісіі ЦК ЛКСМБ па прэміях Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі, тэхнікі і вытворчасці, бюро ЦК ЛКСМ Беларусі пастанавіла:

**прысудзіць прэміі Ленінскага камсамола Беларусі за 1974 год наступным маладым вучоным і спецыялістам:**

**ДЗЕМЧУКУ Міхаілу Іванавічу** — намесніку загадчыка лабараторыі навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, кандыдату фізіка-матэматычных навук, і **МАЛЕВІЧУ Ігару Аляксандравічу** — загадчыку лабараторыі навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, кандыдату тэхнічных навук — за працу «Распрацоўка метадаў прэцызійнага аналізу стахастычных патокаў сігналаў і стварэнне комплексу радыёвымяральнай апаратуры для даследавання верагодных і спектральных характарыстык флуорэсцэнтнага і квазікагерэнтнага выпраменьвання».

# АКТЫЎНА, ПА-ДЗЕЛАВОМУ

Справаздачы і выбары — важнейшая арганізацыйна-палітычная кампанія ў жыцці камсамола.

Сходы і канферэнцыі падвядуць вынікі работы камсамольскіх арганізацый па выкананню рашэнняў XXIV з'езда КПСС, XVII з'езда ВЛКСМ, задач, якія вынікаюць з прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева на з'ездзе, прывітання ЦК КПСС з'езду камсамола.

На сходах неабходна дэталёва разгледзець работу камсамольскіх арганізацый факультэтаў па фарміраванню марксісцка - ленінскага светапогляду, класавай самасвядомасці камсамольцаў і моладзі, ступень уплыву камсамольскага калектыву на кожнага.

Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць абмеркаванню Усесаюзнага паходу камсамольцаў і моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, намеціць дадатковыя меры па паляпшэнню фізкультурнай і абароннамасавай работы. Патрабуюць глыбокага і ўсебаковага абмеркавання пытанні арганізацыйна - палітычнага ўмацавання камсамольскай арганізацыі ў святле патрабаванняў XVII з'езда ВЛКСМ. Важна з усёй адказнасцю аднесціся да правядзення гадавой зверкі, падрыхтоўкі да абмену камсамольскіх дакументаў.

У ходзе падрыхтоўкі да справаздач і выбараў і ў час іх неабходна прааналізаваць выкананне мерапрыемстваў па рэалізацыі крытычных заўваг, якія выказаны на папярэдніх сходах, а таксама прапаноў камсамольцаў і моладзі, унесеных пры абмеркаванні матэрыялаў XVII з'езда ВЛКСМ.

На сходах неабходна цвёрда захоўваць прынцыпы ўнутрысаюзнай дэмакратыі, прадаставіць магчымасць кожнаму члену ВЛКСМ выказаць свае меркаванні аб дзейнасці камсамольскай арганізацыі.

**А. КЛІМОВІЧ.**






# СВЯТА САРДЭЧНАЙ ДРУЖБЫ



Цеплынёй, шчырасцю, сапраўды сяброўскімі пачуццямі было прасякнута святкаванне ва універсітэце 25-годдзя з дня абвяшчэння Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

У суботу на ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае знамянальнаму юбілею, сабраліся студэнты розных факультэтаў, выкладчыкі, супрацоўнікі. У прэзідыуме разам з кіраўнікамі БДУ, прадстаўнікамі студэнцкіх арганізацый і зямляцтваў замежных студэнтаў дэлегацыя Іенскага універсітэта на чале з дэканам факультэта педагогікі, членам Народнай палаты ГДР доктарам Манфрэдам Клаусам.

Сход адкрывае намеснік сакратара парткома БДУ Г. Я. Рылюк. А потым зала з вялікай цікавасцю слухае даклад дацэнта гістфака М. Г. Елісеева аб выдатных вехах развіцця ГДР.

Са словамі падзякі за шчырыя віншаванні, добрыя пажаданні выступіў прафесар Манфрэд Клаус. Ён адзначыў вялікую дапамогу Савецкага Саюза Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі з самых першых дзён яе існавання, расказаў аб трывалых навуковых кантактах Іенскага і Беларускага універсітэтаў.

Пад бурныя апладысменты прафесар М. Клаус уручыў рэктару БДУ, прафесару У. М. Сікорскаму вышэйшую ўзнагароду Іенскага універсітэта, адзначыўшы гэтым яго плённы ўклад у развіццё дружбы і супрацоўніцтва універсітэтаў-партнёраў.

З падзякай прыняўшы ўзнагароду, У. М. Сікорскі падкрэсліў заслугі універсітэцкага калектыву ва ўмацаванні і расшырэнні міжнацыянальных сяброўскіх кантактаў БДУ.

З вялікай цікавасцю слухалі ўдзельнікі сходу студэнта фізфака А. Шылера, які выступіў ад імя нямецкіх студэнтаў, што навучаюцца ў БДУ, а потым шчыра апладзіравалі студэнтам Антону Герчаву (НРБ), Фабрысіо Лінарэс Барэлу (Куба), Іса Давары (Афганістан), аспірантам Нгуен Чыеу Ту і Наташы Абрамавай, якія выказалі сардэчныя віншаванні з выпадку 25-годдзя ГДР.

Наш кар.
Фота **Д. Прэса** і **М. Нечыпарэнкі**.



# СТАРОНКА ПЕРШАКУРСНІКА

## ГАЛОЎНАЕ — ДОБРЫ СТАРТ

Першы год студэнцкага жыцця мінуў. І радасна, і сумна. Нехта з палёгкай скажа:

— Адзін курс ёсць!

Другі ж уздыхне з жалем:

— Засталося ўсяго чатыры гады...

Сёння мы, другакурснікі, можам цвёрда сказаць: хоць за плячыма ўсяго адзін курс, ён быў для нас добрым стартам.

Аглядваешся назад і здзіўляешся: як многа добрага, карыснага, цікавага даў табе першы курс. Цяпер ужо няма той баязлівасці, як у першыя дні вучобы. Усё стала на свае месцы. Усё таямнічае паступова становіцца ясным і зразумелым.

Напэўна, другакурснікі самыя шчаслівыя са студэнтаў. Бо яны ўжо ведаюць, чаго каштуе здача заліку па рымскаму праву і як «ваяваць» з гісторыяй дзяржавы і права зарубежных краін. Яшчэ многа-многа пачарпнулі мы для сябе за год студэнцкага жыцця. Аб гэтым можна і не гаварыць, бо другакурснікі — ведаюць, а першакурснікі — пазнаюць. Калі ж адразу пасвяціць іх ва ўсе таямніцы студэнцкага жыцця, то будзе не так цікава.

Хочацца толькі пажадаць ім цікавага, бурнага, шчаслівага жыцця на караблі студэнцтва, у які б «штормы» яны ні траплялі. Бо ў бурах мужнеюць і мацнеюць. Ці не праўда? І яшчэ хочацца напомніць старую ісціну: усё даступна пры жаданні і не так жахліва, як здаецца на першы погляд.

**Л. МАКСІМАВА,**
**студэнтка II курса юрфака.**

## ЗНАЕМСТВА АДБЫЛОСЯ

**ЕІЯФАК**

Аўдыторыя № 701, напэўна, памаладзела ў гэты дзень: такія юныя, шчырыя ў сваім захапленні ад факультэта, трохі смешныя і радасныя студэнты-першакурснікі запоўнілі яе гэтым кастрычніцкім ранкам.

Першая лекцыя, першы выкладчык, першыя ўражанні... Яны заўсёды самыя яркія, самыя хвалюючыя, самыя... Але паслухаем, што скажуць самі першакурснікі аб сваім першым дні:

— Калі гаварыць дакладна, то гэта ў нас ужо не першая лекцыя. Некалькі дзён мы займаліся ў верасні да паездкі на сельгасработы, — тлумачыць Ліда Аляксандрава.

— А на сённяшняй першай лекцыі нас ужо выклікалі да дошкі, мы рашалі задачы, — падхоплівае Іна Адамовіч, — так што, патроху вучымся вучыцца.

— Калі гаварыць шчыра, то мы нават не ведалі раней, што ўяўляюць сабой лекцыі: будуць нас выклікаць ці не, абавязкова канспектаваць або не зусім — гэтыя і іншыя пытанні здаваліся нам такімі важнымі. І таму, як ні дзіўна, было неяк боязна, хвалююча, незнаёма, — прадаўжае Ліда.

...Першакурснікі, першакурснікі... Яны яшчэ блытаюць аўдыторыі, марна адшукваючы сваю, яны яшчэ не ведаюць, колькі чалавек займаецца ў іх падгрупе, яны яшчэ асцярожна трымаюцца чародкай, выходзячы з аўдыторыі... Але не гэта важна. Галоўнае, што яны вылучаюцца мэтанакіраванасцю, ведаюць, што хочуць узяць на факультэце і што факультэт хоча атрымаць ад іх. Галоўнае, што прыйшлі яны сюды з дапытлівым агеньчыкам у вачах, прагай да ведаў, прыйшлі па прызванню.

— Я не ўяўляю, дзе можна было б мне яшчэ вучыцца, — прызнаецца знаёмая нам Ліда Аляксандрава. — Пяць гадоў я займалася біялогіяй, а цікавілася з'явамі прыроды, жыццём птушак і раслін, напэўна, зусім з дзяцінства. Цяпер жа мая мара — біяхімія. І я веру — яна абавязкова здзейсніцца.

**ГЕАФАК**

...У камітэт камсамола факультэта па-аднаму ўваходзяць рабяты. Сёння, у панядзелак, першы дзень заняткаў — рабочы сход стараст першага курса. Пакуль усе збіраюцца, пагаворым з Лёнем Сушко і Аляксандрам Радзьковым. На традыцыйнае пытанне «Чым запомніліся першы дзень, першая лекцыя?» рабяты адказваюць:

— Мы прыйшлі на геафак з падрыхтоўчага аддзялення. Але, канешне, усведамленне таго, што ты паўнаўладны студэнт факультэта, надавала гэтаму дню ўрачыстасць, прыўзнятасць. Нашы першакурснікі ад хвалявання нават расчырванеліся.

У камітэт заходзіць Алег Слепіца, таксама стараста і таксама першакурснік.

— Цяжка адразу сказаць, што я адчуваў у гэты дзень. Быццам бы тыя ж званкі, тыя ж «урокі», выкладчыкі. Але адразу заўважыў нейкія «асобыя» адносіны да сябе — не як у школе. Форма выкладання, якасць... А ўвогуле было здарава. Столькі многа людзей. Мы яшчэ і не пазнаёміліся як след. Некаторых, праўда, я памятаў па ўступных экзаменах. Сустрэчы вельмі ўзрадаваліся...

Пачынаецца сход. Новыя студэнты факультэта абмяркоўваюць важныя праблемы—выбары ў групах, кантроль за наведваннем заняткаў, завяршэнне падпіскі на газеты і часопісы... Шмат клопатаў у цябе, першакурснік.

**Т. СКІБІЦКАЯ,**
**Н. НОВІКАВА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

## ПРАВА ВЫБАРУ

Якім павінен быць сучасны студэнт? Гэта пытанне хвалюе многіх, асабліва першакурснікаў. Зрэшты, іх выкладчыкаў не менш.

Зразумела, ён павінен вельмі многа ведаць. Але ж, як ні дзіўна, не гэта галоўнае. Галоўнае — навучыцца думаць, разважаць, іншымі словамі, творча адносіцца да вучобы. Менавіта гэтаму вучаць студэнтаў на працягу пяці студэнцкіх год, менавіта гэта якасць у першую чаргу неабходна сучаснаму спецыялісту, дзе б ён ні працаваў. Якраз яна, развітая ў дастатковай меры, дапамагае ўпэўнена арыентавацца не толькі ў складаных навуковых сітуацыях, але і ў жыцці наогул.

З цягам часу ў кожнага студэнта вырысоўваецца яго ўласная «спецыялізацыя»: цяга да навуковай работы, спорту ці грамадскага жыцця. Зразумела, такая класіфікацыя і вельмі ўмоўная, і далёка не поўная. Усё ж я з большай сімпатыяй адношуся да першай катэгорыі. Аднак, шчыра кажучы, з цяжкасцю ўяўляю вучонага, які не мае ніякіх адносін да спорту, які не ўмее ярка, пераканаўча і дастаткова кваліфікавана адстойваць свае меркаванні ў пытаннях літаратуры, мастацтва і ў любых пытаннях наогул. Карацей кажучы, пры ўсёй сваей вузкай спецыялізацыі універсальнасць — гэта тое, да чаго мы пастаянна павінны імкнуцца.

Першакурснік! Гэта далёка не ўсе пытанні, на якія табе абавязкова прыйдзецца адказаць. Пры гэтым старайся ні ў якім разе не згубіць сябе.

**В. БАЛАШЧАНКА,**
**асістэнт кафедры геаметрыі матэматычнага факультэта.**

Адышоўшае лета было ў поўным сэнсе «гарачым» для сённяшніх першакурснікаў. Аб гэтым сведчаць здымкі, зробленыя ў час уступных экзаменаў. Прыгледзьцеся, ці не такімі былі і вы?







*Штогод на кожным факультэце першакурснікі карыстаюцца асаблівай увагай. Іх знаёмяць з універсітэтам, дапамагаюць хутчэй акліматызавацца ў студэнцкай атмасферы.*

*І шматтыражка БДУ рэгулярна публікуе матэрыялы спецыяльна для першакурснікаў.*

*Сённяшнюю старонку падрыхтавалі для вас няштатныя карэспандэнты газеты.*

## ТУТ ВАС ЧАКАЮЦЬ

Кабінетам кафедр грамадскіх навук належыць важная роля ў павышэнні эфектыўнасці вучэбнай, метадычнай, выхаваўчай работы выкладчыкаў, у арганізацыі самастойнага вывучэння студэнтамі курса гісторыі КПСС. У час падрыхтоўкі да новага навучальнага года, камплектавання кабінета новай літаратурай, сістэматызацыі каталогаў, размеркавання літаратуры па тэмах курса і г. д. супрацоўнікі кабінета ўдзялялі вялікую ўвагу пытанням арганізацыі работы з першакурснікамі.

Прыступіўшы да вывучэння гісторыі партыі, студэнты павінны кіравацца праграмай курса «Гісторыя КПСС». У ёй акрэслена асноўнае кола пытанняў па тэмах, указана літаратура. Кабінет мае неабходную колькасць праграм для студэнтаў гуманітарных факультэтаў, іх можна атрымаць у супрацоўнікаў кабінета.

Важнае месца ў вучэбным працэсе займаюць семінарскія заняткі. Да іх студэнты павінны вывучыць рэкамендаваную літаратуру, законспектаваць яе.

У падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў вялікую метадычную і практычную дапамогу можа аказаць кабінет. Тут ёсць усё неабходнае для падрыхтоўкі да заняткаў: творы У. І. Леніна, рашэнні партыйных з'ездаў, канферэнцый, пленумаў, вучэбная літаратура, падшыўкі газет, наглядныя дапаможнікі, выстаўкі новых кніг па гісторыі КПСС, метадычнай літаратуры.

Супрацоўнікі кабінета акажуць першакурснікам дапамогу ў выбары дадатковай літаратуры, правядуць кансультацыю па асноўных пытаннях. У іх студэнты змогуць атрымаць бібліяграфічныя даведкі.

Пры вывучэнні гісторыі КПСС вельмі важна самастойная работа над курсам. Асноўную ўвагу тут неабходна звярнуць на вывучэнне твораў У. І. Леніна і партыйных дакументаў. Практыка паказвае, што больш мэтазгодна займацца менавіта ў кабінеце. Яго супрацоўнікі дапамогуць разабрацца ў пытаннях, што паявіліся пры чытанні першакрыніц, вучэбнай літаратуры, дапамогуць набыць навыкі самастойнай работы з рэкамендаванай літаратурай. Будзе карыснай іх парада пры падборы, сістэматызацыі матэрыялу, афармленні даведніцка - бібліяграфічнай літаратуры у час работы над дакладамі, рэфератамі, навуковымі і курсавымі работамі.

Кабінет арганізуе прагляд дыяфільмаў па курсу «Гісторыя КПСС», праслухоўванне запісаў прамоў У. І. Леніна, кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, відных дзеячоў міжнароднага камуністычнага руху.

Рэгулярнае наведванне кабінета, сістэматычная самастойная работа — залог цвёрдых ведаў, поспехаў у вучобе.

**П. БРЫГАДЗІН,**
**загадчык кабінета гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў.**

## ПАСЯБРУЙ СА СПОРТАМ

Фізічнае выхаванне, як неад'емная частка навучання і выхавання студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, садзейнічае іх усебаковаму развіццю, падрыхтоўцы да працы і абароны Радзімы.

Ва універсітэце спартыўны клуб і кафедра фізвыхавання і спорту праводзяць вялікую работу па ўмацаванню здароўя і павышэнню спартыўнага майстэрства студэнтаў. Спартыўны калектыў БДУ аб'ядноўвае звыш 8 тысяч студэнтаў. Ён з'яўляецца адным з вядучых сярод ВНУ нашай рэспублікі.

Больш 3 тысяч студэнтаў рэгулярна займаюцца ў спартыўных секцыях па 25 відах спорту. Найбольш масавыя з іх—лёгкая атлетыка, лыжы, валейбол, баскетбол, спартыўная гімнастыка, вольная і класічная барацьба, цяжкая атлетыка. Шырокае развіццё ва універсітэце атрымаў турызм.

Заняткі па фізічнаму выхаванню са студэнтамі I—II курсаў праводзяцца ў групах спартыўнай спецыялізацыі. Першакурснікі могуць выбраць для заняткаў адзін з 8 відаў спорту: лёгкую атлетыку, лыжы, спартыўную і мастацкую гімнастыку, вольную і класічную барацьбу, валейбол, цяжкую атлетыку. Тыя, хто мае разрад, змогуць павышаць сваё майстэрства ў групах спартыўнага ўдасканалення.

З ліку студэнтаў, якія займаліся ў групах спартыўнага ўдасканалення і спартыўнай спецыялізацыі, толькі за 9 месяцаў 1974 г. кафедрай фізвыхавання і спартыўным клубам падрыхтавана 6 майстроў спорту, 8 кандыдатаў у майстры спорту, 81 спартсмен I разраду і звыш 2 тысяч спартсменаў II і III разрадаў.

Фізкультура і спорт трывала ўваходзяць у быт нашых студэнтаў. Рэгулярна праводзяцца масавыя спаборніцтвы, турысцкія паходы, лыжныя вылазкі, а ў летні час многія студэнты выязджаюць у аздараўленча-спартыўны лагер на возера Нарач.

Вялікая работа праводзіцца сярод студэнтаў і супрацоўнікаў па падрыхтоўцы значкістаў ГПА. Толькі ў 1973—1974 навучальным годзе ў БДУ падрыхтавана больш чатырох тысяч значкістаў ГПА.

Кожны год праводзіцца агульнауніверсітэцкая традыцыйная спартакіяда, у праграму якой уваходзяць спаборніцтвы па 22 відах спорту. Толькі ў мінулым навучальным годзе ў XXII спартакіядзе універсітэта прыняло ўдзел каля сямі тысяч студэнтаў.

Паспяхова выступалі спартсмены універсітэта ў спаборніцтвах XVII рэспубліканскай спартакіяды ВНУ. Так, у мінулым навучальным годзе нашы зборныя каманды па мастацкай гімнастыцы і лёгкай атлетыцы (зімой), баскетболу (жанчыны) заваявалі I месца; па цяжкай атлетыцы, фехтаванню, лёгкай атлетыцы (летам) занялі II месца.

Добрай традыцыяй сталі рэгулярныя сустрэчы спартсменаў БДУ са спартсменамі Ленінграда, Львова, Літвы і іншых гарадоў і рэспублік.

Кожны год праводзіцца шэраг спаборніцтваў для студэнтаў першых курсаў. У кастрычніку адбудуцца сустрэчы па валейболу, баскетболу, стральбе, лёгкай атлетыцы і іншых відах спорту, а таксама асенні крос.

З 1 кастрычніка пачаліся заняткі ў групах спартыўнага ўдасканалення. Першакурснікі могуць наведваць гэтыя заняткі.

Сёння ў 16 гадзін у актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца сход студэнтаў першых курсаў, якія жадаюць займацца ў спартыўных секцыях.

Кафедра фізвыхавання і спартыўны клуб упэўнены ў тым, што студэнты-першакурснікі актыўна ўключацца ў спартыўнае жыццё нашага калектыву. Бо ад таго, якую падрыхтоўку і загартоўку атрымае спецыяліст у сценах вышэйшай навучальнай установы, залежыць поспех яго будучай работы.

**В. ШАПЯЛЕВІЧ,**
**старшыня спортклуба універсітэта.**

Камсамольскае жыццё

# З ЯКІМІ Ж ВЫНІКАМІ?

## НАТАТКІ З НЕАДБЫЎШАГАСЯ ПАСЯДЖЭННЯ

Выконваючы абавязкі сакратара камітэта камсамола матфака, студэнт чацвёртага курса Уладзімір Левашкевіч раз-пораз пазірае на гадзіннік, у акно, за якім добра ўжо расправіў крылы вечар. Сёння ў 19.10 пасяджэнне актыву камітэта камсамола.

Мінуў вызначаны час. У пакоі ўсяго чатыры актывісты. Сярод іх Марыя Кавальская і Святлана Спас, адказныя адпаведна за шэфскую работу і арганізацыйны сектар.

— Колькі членаў налічвае камітэт?

Дванаццаць, — гучыць у адказ.

У. Левашкевіч прапануе перанесці разгляд пытанняў на больш позні час, на іншы дзень. Сваё рашэнне матывуе адсутнасцю астатніх членаў камітэта.

Можна разыходзіцца. Але іншай думкі прытрымліваецца сакратар партбюро матэматычнага факультэта А. У. Самсонаў. Анатоля Уладзіміравіча цікавіць, з якімі ж вынікамі ў камсамольскай рабоце падыходзяць юнакі і дзяўчаты да справаздачна-выбарнага сходу.

Тлумачэнні дае У. Левашкевіч:

— Чаму дрэнна працаваў культурна-масавы сектар? На маю думку, добра было б сёння паслухаць адказную — Святлану Яршову. На жаль, яна адсутнічае. Ад сябе дадам, і, думаю, усе будуць згодны — сектар бяздзейнічае. Яго кіраўнік не здолеў наладзіць работу, абыякава дзяўчына аднеслася да свайго абавязку. Прыклад таму: камітэт даручыў С. Яршовай правесці агляд мастацкай самадзейнасці на курсах. Заданне не было выканана.

— А чым дапамаглі дзяўчыне вы, члены камітэта? — цікавіцца Анатоль Уладзіміравіч. — Ці не па гэтай прычыне нашы самадзейныя артысты на універсітэцкіх аглядах займаюць далёка не прызавыя месцы?

У адказ красамоўнае маўчанне.

Так, работа культурна-масавага сектара, як і некаторых іншых, патрабуе неадкладнага паляпшэння. І новаму камітэту камсамола прыйдзецца шмат папрацаваць, перш чым будуць дасягнуты пэўныя вынікі.

У час прынцыповай, дзелавой гутаркі размова ішла і аб справах спартыўнага сектара.

— Пахваліцца пакуль што няма чым, — гаворыць Уладзімір.—Добрых каманд, акрамя шашыстаў і шахматыстаў, раз, два — і ўсё...

Тут неабходна ўдакладніць, што і саміх каманд па сутнасці няма. Увогуле, яны існуюць... на паперы. Не вельмі спрыяльныя і ўмовы для трэніровак. Таму і месцы, занятыя матфакаўцамі ў спартыўных спаборніцтвах, больш чым сціплыя.

Цікава, што скажуць у час свайго выступлення на справаздачна-выбарным сходзе адказныя за спартыўную работу Аляксандр Вінаграў і яго намеснік Міхаіл Будкін?

— Спартыўныя каманды на факультэце ў прынцыпе можна стварыць, — слушна ўдакладніў А. У. Самсонаў. Але паклапаціцца аб гэтым патрэбна ўжо сёння. Хай сёлета яны яшчэ не будуць здольнымі абараняць гонар факультэта, але ж мы павінны думаць аб заўтрашнім дні.

Сапраўды, ідуць жа рэгулярныя заняткі ў даўно створаных секцыях барацьбы і самба. Чаму б па іх прыкладу не стварыць секцыі баскетбола, футбола, настольнага тэніса і іншыя?

Некалькі слоў хацелася б сказаць у адрас спартсменаў, якія ўваходзяць у зборныя каманды універсітэта, але ў той жа час не робяць ніякіх захадаў для паляпшэння спартыўных спраў на родным факультэце. А яны ж павінны ў першую чаргу падаваць прыклад, дапамагаць у стварэнні каманд.

І яшчэ адно важнае пытанне было закранута — вакальна-інструментальны ансамбль.

— Над гэтай праблемай мы б'ёмся ўжо каторы год, —расказвае У. Левашкевіч. —А маем усяго дзве гітары ды ўдарныя. Праўда, думаецца, цяпер справа скранулася з месца. На чале ансамбля стаў студэнт трэцяга курса Уладзімір Емельянчык, добры арганізатар і актыўны камсамолец.

У гутарцы ў асноўным размова ішла пра сектары, работа якіх патрабуе тэрміновага паляпшэння. На матфаку ж больш дзесяці камісій і сектараў. Адны працуюць лепш, іншыя — горш. Добрага слова заслугоўваюць студэнты-матэматыкі, якія стварылі ў інтэрнаце свой самадзейны тэатр, рэдкалегія насценгазеты «Рошым любую задачу», акадэмічны сектар.

На камсамольскім уліку матэматычнага факультэта 1070 юнакоў і дзяўчат. Лічба унушальная. Кіраваць такой шматлікай арганізацыяй не лёгка. І аб гэтым была думка А. У. Самсонава, які параіў узняць пытанне аб колькасным складзе камітэта на справаздачна-выбарным сходзе.

**В. ЗАДАЛЯ.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

ІДЗЕ ПРАКТЫКА

# ВЕЛЬМІ ЗАДАВОЛЕНЫ

Цяперашніх пяцікурснікаў факультэта прыкладной матэматыкі размеркавалі на месцы іх будучай работы яшчэ ў мінулым годзе.

Наташа Самойлава засталася ў аддзеле прыкладной статыстыкі вылічальнага цэнтра БДУ. Тут і адбылася наша кароткая размова. Наташа адклала ў бок разлікі і з нечаканым для мяне захапленнем пачала расказваць:

— Вельмі задаволена практыкай. Хутка месяц, як я тут працую, і кожны дзень іду на работу з ахвотай...

Спахапіўшыся, працягвала ўжо больш стрымана:

— Наша задача — непасрэднае знаёмства з будучай работай. Аддзел займаецца апрацоўкай вынікаў сацыялагічных і медыка-біялагічных абследаванняў.

— А чым вы займаецеся зараз? — пытаю я.

— Апрацоўваем вынікі абследаванняў, якія праводзіць спорткафедра нашага універсітэта. Нам даюць табліцы — вось адна з іх. Тут толькі лічбы. А мы разам з аднакурсніцай Таняй Халопіца павінны скласці праграму, згодна з якой машына «Мінск-32» зробіць патрэбныя вылічэнні.

А ці былі такія выпадкі, калі вы станавіліся ў тупік? — цікаўлюся я.

— Не, не было, — усміхаецца Наташа і дадае:

— Калі і здарыцца такое, то на дапамогу абавязкова прыйдуць старэйшыя, вопытныя супрацоўнікі аддзела. Заўсёды дасць добрую параду начальнік — Яўген Рыгоравіч Грышкоў.

— Напэўна, вы займаецеся і грамадскай работай?

— А як жа! Мы з Таняй чытаем для супрацоўнікаў лекцыі па ФАРТРАНу, — гэта адна з моў праграміравання. Яны ў свой час не вывучалі яе, а мова вельмі зручная для нашых праграм. Думаем закончыць гэты курс за паўгода, а то і раней.

Акрамя гэтага, мы заўсёды імкнемся прымаць удзел у палітінфармацыях.

Увогуле, і працаваць, і знаходзіцца ў гэтым калектыве вельмі цікава. Мы задаволены нашай практыкай.

**М. ШЫМКО.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**





**Напружана працуюць у гэтыя дні пяцікурснікі. Апошні год вучобы — год канчатковага выпрабавання на званне спецыяліста, знаўцы, год вынікаў.**

**● Сярод дыпломнікаў на кафедры фізіялогіі чалавека біялагічнага факультэта — Ларыса Ляўковіч і Наталля Шаго. Сяброўкі выдатна вучацца. Наш фотакарэспандэнт зазняў дзяўчат на лекцыі па фізіялогіі вегетатыўнай нервовай сістэмы.**

**● Шмат працуюць студэнты-біёлагі і ў лабараторыях. Тут вы бачыце пяцікурсніцу Святлану Судзейную, якая праводзіць доследы па вывучэнню ўплыву розных доз мінеральных угнаенняў на фенольныя злучэнні ў бульбе.**

Фота **А. ЦЫГУЛЁВА.**

# ЗАПРАШАЕ РАБФАК

Толькі што сціхлі хваляванні абітурыентаў, і ўжо з першага кастрычніка пачала работу прыёмная камісія падрыхтоўчага аддзялення, якое існуе ў нашым універсітэце шосты год. Гэтая форма навучання, што ідзе ад традыцый рабфакаў, дае новыя магчымасці для паступлення ва універсітэт рабочай і вясковай моладзі, якая даўно скончыла школу і мае ўжо пэўны жыццёвы вопыт, вызначыла выбар сваёй прафесіі.

Першыя выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення перайшлі на пятыя курсы фізфака, матфака, біяфака і хімфака. Гэта Н. Н. Прышчэпа, П. П. Турайкевіч (фізфак), Т. С. Вершаль (ФПМ), А. С. Гарэлышаў, З. І. Конкіна-Гарэлышава, Р. М. Дубянец (біяфак), В. Н. Шулякоўскі, О. В. Ясько (хімфак) і многія іншыя. Яны прынеслі свае працоўныя традыцыі ў студэнцкае асяроддзе актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці факультэтаў і універсітэта.

Як правіла, яны назначаюцца старастамі, актыўна працуюць у партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацыях факультэтаў. Нягледзячы на вялікі перапынак у вучобе, значная частка студэнтаў, былых слухачоў аддзялення, вучыцца толькі на добра і выдатна. Сярод іх М. Сакалоўскі, А. Страенка, В. Дзенісенка, В. Нікалаеўскі, В. Карагін, В. Трамбіцкі, В. Салаўёў і іншыя.

Добрай традыцыяй стаў удзел рабфакаўцаў у студэнцкіх будаўнічых атрадах. У гэтым годзе былі сфарміраваны тры такія атрады. Амаль 40 працэнтаў выпускнікоў аддзялення працавала ў час канікулаў на будоўлях г. Мінска і Мінскай вобласці.

Мінулагоднія выпускнікі аддзялення толькі пачынаюць студэнцкі шлях. А падрыхтоўчае аддзяленне жыве клопатамі новага навучальнага года. Прыём слухачоў праводзіцца па ўсіх спецыяльнасцях і на ўсе факультэты універсітэта да 10 лістапада. Камісія ў складзе прадстаўнікоў рэктарата, партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый, выкладчыкаў прафіліруючых дысцыплін гутарыць з кожным паступаючым, адбірае з ліку накіраванай на вучобу моладзі лепшых, найбольш падрыхтаваных.

Аднымі з першых падалі дакументы Р. Негацін, член КПСС, які мае дванаццаць гадоў вытворчага стажу і накіраван на вучобу Бігосаўскім заводам «Заветінструмент», М. Аўсюк, кандыдат у члены КПСС, член камсамольска-маладзёжнай брыгады, якая ўдастоена звання «Брыгада камуністычнай працы». Прыйшоў да нас дэмабілізаваны з радоў Савецкай Арміі Н. Глазко, кандыдат у члены КПСС, выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Паступае А. Карачун, швачка Баранавіцкай швейнай фабрыкі, ударніца камуністычнай працы. Спадзяёмся, што гэтыя людзі хутка будуць студэнтамі БДУ.

**М. ЧУДАЕЎ.**

# ПРАГРАМА РАБОТЫ ВЫЗНАЧАНА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

Другая форма актывізацыі гэтай работы — далейшае ўдасканаленне студэнцкіх навуковых даследаванняў. Прадугледжваецца абмеркаваць практыку напісання студэнтамі дакладаў і рэфератаў па праблемах навуковага камунізму. На VI Усесаюзны конкурс па грамадскіх навуках, які адбудзецца ў 1976 г., кожны выкладчык кафедры падрыхтуе не менш дзвюх студэнцкіх навуковых работ. Пры гэтым ставіцца задача больш шырокага ўцягнення ў навукова-даследчую работу замежных студэнтаў.

Зразумела, што паспяховае ажыццяўленне гэтых задач цесна звязана з далейшым развіццём навуковых даследаванняў саміх выкладчыкаў, а таксама з паляпшэннем падрыхтоўкі аспірантаў — будучых выхавацеляў студэнтаў. Таму ў трэцім раздзеле сваіх мерапрыемстваў кафедра прадугледжвае забяспечыць безумоўнае выкананне планаў навукова-даследчай работы на 1974—1975 і 1976—1980 гады, канцэнтраваць і далей увагу выкладчыкаў і аспірантаў на праблемах горада і вёскі, камуністычнага выхавання працоўных.

Ужо ў гэтым навучальным годзе будзе поўнасцю завершана падрыхтоўка да выдання вучэбнага дапаможніка «Навуковы камунізм. Курс лекцый» аб'емам 38 д. а. і тэматычнага зборніка «Пытанні сацыяльнага развіцця сацыялістычнага грамадства ў сучасных умовах» аб'ёмам 15 д. а. Распрацаваныя на аснове багатага навейшага матэрыялу з шырокім прыцягненнем партыйных дакументаў і матэрыялаў, яны дапамогуць палепшыць работу па фарміраванню навуковага марксісцка-ленінскага светапогляду студэнтаў. Акрамя гэтага, мы плануем абмяркоўваць на кафедры актуальныя навукова-тэарэтычныя праблемы навуковага камунізму і без прамаруджання даводзіць іх да студэнцкай аўдыторыі.

Адначасова ў мерапрыемствах удзяляецца вялікая ўвага пытанням камплектавання аспірантуры па навуковаму камунізму, удасканаленню тэматыкі навуковых даследаванняў аспірантаў, усёй іх навукова-метадычнай падрыхтоўкі. Кафедра, у прыватнасці, абавязала навуковых кіраўнікоў аспірантаў узмацніць кантроль і дапамогу ў рабоце не толькі над тэмай іх даследавання, але і над усёй праграмай выканання індывідуальнага плана падрыхтоўкі.

Нарэшце, нашы мерапрыемствы прадугледжваюць далейшую актывізацыю ўдзелу членаў кафедры ў грамадска-палітычнай і выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў. З гэтай мэтай адкарэкціравана прыкладная тэматыка выступленняў выкладчыкаў па праблемах навуковага камунізму перад студэнтамі і працоўнымі г. Мінска і рэспублікі. Плануецца таксама перыядычна заслухоўваць асобных выкладчыкаў аб ходзе іх работы ў сетцы партыйнай асветы, аказваць неабходную дапамогу факультэтам у арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў.

Члены кафедры будуць рэгулярна наведваць студэнцкія інтэрнаты, арганізоўваць вечары пытанняў і адказаў, гутаркі за «круглым сталом».

У гэтым навучальным годзе мы плануем правесці такія вечары і гутаркі сярод студэнтаў біёлагаў, юрыстаў і журналістаў. Акрамя таго, нашы выкладчыкі будуць сістэматычна выступаць з лекцыямі, дакладамі і гутаркамі па праблемах навуковага камунізму перад работнікамі прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, шырока прапагандуючы бессмяротныя ідэі марксізму-ленінізму, выхоўваючы актыўных будаўнікоў камуністычнага грамадства.

**І. СМАЛЬЦАР,**
**в. а. дацэнта кафедры навуковага камунізму, кандыдат філасофскіх навук.**

ДА 160-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. Ю. ЛЕРМАНТАВА

# ВЕХІ ЖЫЦЦЯ

*Лермантаў загінуў на 27 годзе жыцця. Цяпер паэта ў такім узросце называюць маладым, падаючым надзеі. Але ўжо даўно даказана, што маладосць—не перашкода паэзіі. Хутчэй наадварот. Паэтычная таленавітасць праяўляецца наогул рана. Пушкін пачаў пісаць вершы ў 14 год, Лермантаў — у 14, Ясенін — у 15, Някрасаў — у 17, Блок — у 17, Маякоўскі — у 19.*

*У пятнаццаць год Лермантаў робіць першы накід паэмы «Дэман». З гэтага часу на працягу больш дзесяці год вобраз гордага дэмана праследуе паэта. Паэма вядома ў шасці рэдакцыях і скончана ім незадоўга да смерці. У многіх пісьменнікаў ёсць такія ж любімыя вобразы, якія суправаджаюць іх усё жыццё. Напрыклад, для Гётэ такім быў Фауст.*

*У семнаццаць год Лермантаў пісаў:*

*Пора уснуть последним сном,*
*Довольно в мире пожил я...*

*Ведаючы, што гэтыя радкі напісаны 17-гадовым юнаком, іх успрымаеш як паэтычную вольнасць, як прымерку на сябе адзення пажыўшага і выпрабаваўшага жыццё чалавека.*

*Але ўжо 18-гадовым паэтам напісаны выдатныя радкі:*

*Нет, я не Байрон, я другой,*
*Ещё неведомый избранник...*

*Пра гэтыя радкі не скажаш, што яны юныя. Яны ўражваюць глыбінёй і сталасцю думкі, ясным усведамленнем свайго паэтычнага прызвання. «Я раньше начал, кончу ране...» — тут ужо ўгадваецца трагедыйны шлях паэта ў сучасным грамадстве.*

*У 18 год Лермантаў выходзіць з Маскоўскага універсітэта і паступае ў школу гвардзейскіх юнкераў і падпрапаршчыкаў. У дваццаць — узведзен у афіцэры. А у 21 год напісан «Маскарад». Нараджаецца вобраз Арбеніна, «дзіўнага чалавека», дэманічнай натуры, папярэдніка Пячорына. Хутка ўслед за Арбеніным у творчасць паэта ўваходзіць новы герой, будучы «герой нашага часу» Пячорын у незакончанай аповесці «Княгіня Лігаўская». У гэты ж час паяўляецца першы друкаваны твор Лермантава — паэма «Хаджы Абрэк» у часопісе «Біблiятэка для чытання», надрукаваная без ведама паэта яго сябрамі.*

*У 22 гады напісан выдатны верш «На смерць паэта». Выклік быў кінут. Лёс паэта змяніўся. Тое, што зычылі яму родныя — бліскучае будучае гвардзейскага афіцэра, кар'еру, — усё было адвергнута. Затое ў літаратуру прыйшоў новы сталы паэт, пераемнік Пушкіна. Яму заставалася чатыры з палавінай гады жыцця, і яны не былі пражыты ўпустую.*

*У 25 гадоў напісан «Герой нашага часу» — падзея ў рускай літаратуры, геніяльны ўзор рускай прозы. У 26 год закончан «Дэман», напісана паэма «Мцыры». Выдан адзіны прыжыццёвы збор вершаў, выйшла асобнае выданне «Героя нашага часу». Лермантаў знаходзіўся ў росквіце свайго таленту. Ён выношваў новыя задумы і збіраўся пісаць «рамантычную» трылогію з трох эпох рускага жыцця (з эпохі Екацярыны II, Аляксандра I і сучаснай эпохі). Бялінскі параўноўваў будучыню Лермантава з вышынёй Івана Вялікага. Гогаль меркаваў, што Лермантаў-празаік пераўзыйдзе Лермантава-паэта. «Рыхтаваўся будучы вялікі жывапісец рускага быту», — гаварыў ён. Але паэт быў забіт «бязлітаснай рукой».*

*Паэт пражыў неспакойнае, бунтарскае, насычанае жыццё. Ён вучыўся ў Маскоўскім універсітэце, быў юнкерам, служыў у лейб-гвардзейскім палку, у Тэнгінскім пяхотным палку, ваяваў на Каўказе і вызначыўся ў баявых дзеяннях, вёў свецкае жыццё... Нельга не здзіўляцца яго вялікай працаздольнасці, велізарнаму ўнутранаму засяроджанню.*

П. ГОЛУБЕЎ.



М. Ю. ЛЕРМАНТАЎ

## ВЕТРАЗЬ

Бялее ветразь адзінокі
Там, дзе блакітны небасхіл.
Чым вабіць свет яго далёкі?
Чым родны край яму не міл?

Б'е хваля, вецер завывае,
І мачта гнецца і рыпіць;
Ды не! ён шчасця не шукае
І не ад шчасця прэч бяжыць! —

Пад ім струмень святлей за просінь,
Над ім прамень нябесны той; —
А ён, бунтоўны, буры просіць,
Нібыта ў бурах ёсць спакой!

* * *

**Я не хачу, каб свет чытаў**
**Маю таемную аповесць;**
**Аб тым, як жыў я і кахаў,**
**Я не яму складаю споведзь!..**

**Бог і сумленне суддзі ёй,**
**Да іх пакутай я прыкуты;**
**І хай мяне карае той,**
**Хто вынайшаў мае пакуты;**

**Дакор пусты, дакор людскі**
**Душы высокае не ўзрушыць;**
**Няхай шуміць прыбой марскі —**
**Уцёса хвалямі не зрушыць;**

**Стаіць ён, дзвюх стыхій жыхар:**
**Вышынь панурых, хваль шалёных,**
**І, апрача грымот і хмар,**
**Ніхто не знае дум ягоных...**

Пераклад А. КУЛЯШОВА.

# З ЛЮБОЎЮ, ПА-ГАСПАДАРСКУ

Аб Беларусі не дарэмна гавораць як аб краі лясоў, кладоўцы багатых прыродных рэсурсаў. І не дзіўна, што ахова гэтых багаццяў стала ўсенароднай справай. Вялікая роля тут належыць Таварыству аховы прыроды.

У пярвічныя арганізацыі універсітэцкага аддзялення таварыства ўваходзіць каля 5.000 чалавек — студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў. Узначальвае яго прафесар І. К. Лапацін. У актыве арганізацыі нямала карысных спраў. З мэтай прапаганды аховы прыроды на факультэтах ствараюцца фотавыстаўкі. На біяфаку, напрыклад, афармлены дзве такія выстаўкі, на геафаку— адна. Нядаўна распрацаван праект пастаяннай экспазіцыі па ахове прыроды.

Актыўна працуе, добрасумленна адносіцца да даручанай справы студэнцкая дружына «Зялёны патруль». Яе члены штогод чытаюць шмат дакладаў, лекцый, прыцягваюць да работы шырокі актыў, выступаюць у друку і па тэлебачанню. Удзельнікі «Зялёнага патруля» неаднаразова выязджалі на прадпрыемствы Мінска, выступалі з лекцыямі перад школьнікамі ў кінатэатры «Піянер». Вялікую актыўнасць у лекцыйнай прапагандзе праяўляюць студэнты біяфака, геафака, юрфака.

Рэгулярна ў тэлеперадачах, прысвечаных ахове прыроды, выступае загадчык кафедры фізічнай геаграфіі зарубежных краін прафесар В. Р. Заўрыеў.

Студэнцкі «Зялёны патруль», члены якога маюць правы грамадскіх інспектараў, непасрэдна ўдзельнічае ў ахове прыроды. У перыяд паляўнічага сезону, напрыклад, яны папярэджваюць выпадкі браканьерства, берагуць лес ад парубкі.

У мінулым годзе на факультэце грамадскіх прафесій пачалася падрыхтоўка грамадскіх інструктараў па ахове прыроды. Зроблен ужо першы выпуск слухачоў. Яны, атрымаўшы неабходныя веды, будуць працаваць больш мэтанакіравана.

Прапаганда ведаў аб прыродзе, яе ахове, работа па азеляненню, зберажэнню і выкарыстанню прыродных рэсурсаў у арганізацыі БДУ была станоўча ацэнена на раённай канферэнцыі.

У гэтым навучальным годзе непасрэдна пытаннямі аховы прыроды будзе займацца створаная на біяфаку новая кафедра экалогіі, гідрабіялогіі і аховы прыроды, якую ўзначальвае дацэнт У. П. Ляхновіч.

І. САВЕТКІНА, студэнтка журфака.



НА ПРЫПЯЦІ. Фота Я. БАРОЎСКАГА.

Зборнік літаратурна-крытычных нарысаў А. М. Адамовіча прысвечан праблемам сучаснага літаратурнага развіцця: ідэйна-эстэтычнаму ўзроўню беларускай прозы, паглыбленню наватарства і абнаўленню яе традыцый і сувязей з рускай і іншымі літаратурамі, лёсам народным і лёсам літаратуры.

Сам факт выхаду зборніка ў свет на рускай мове ў выдавецтве «Советский писатель» сведчыць не толькі аб прызнанні ўсесаюзным чытачом здабыткаў беларускай мастацкай літаратуры, але і аб яго пільнай увазе да дасягненняў беларускай крытычнай думкі.

## АКРЭСЛЕНЫЯ ГАРЫЗОНТЫ

По сутнасці кніга А. Адамовіча прадстаўляе сабою кароткі, але глыбока прадуманы і кампазіцыйна цэлы курс гісторыі беларускай савецкай прозы.

Ад заваявання да завявання прасочвае даследчык магутны і ўвесь час папаўняючыйся новымі імёнамі і адкрыццямі літаратурны працэс у рэчышчы адзінай шматнацыянальнай савецкай літаратуры. Кніга адкрываецца ўводным нарысам — «Талстоўскі крок». Ён — аб вытоках беларускай прозы, якая бярэ пачатак у глыбінях вуснай народнай творчасці і развіваецца на аснове традыцый рускай рэвалюцыйна-дэмакратычнай і сусветнай класікі.

У раздзеле «Паэтычнае вярхоўе беларускай прозы» размова ідзе аб перадгісторыі беларускага рамана, яго жанравай формы. Даследаванне літаратурнага працэсу ў плане канкрэтнага сацыяльна-гістарычнага аналізу дазваляе прыйсці да вываду аб тым, што паэзія праклала шлях беларускай прозе. На шырокіх літаратурных сувязях і паралелях аўтар разглядае значэнне «Новай зямлі» Я. Коласа ў развіцці эпічных жанраў, у прыватнасці беларускага рамана. Ад «Новай зямлі» ляжыць прамы шлях да палескіх аповесцей Я. Коласа, да раманаў К. Чорнага.

У наступным раздзеле — «Шлях да вялікай прозы»— аўтар прасочвае творчы шлях К. Чорнага.

Аб наватарскім пераасэнсаванні традыцыйнага ў нашай прозе, аб рэалістычнай тэндэнцыі ў ёй ідзе гутарка ў раздзеле «Вяртанне наперад». Гэта пераважна традыцыйныя па матэрыялу і стылістыцы сацыяльна-бытавыя і гісторыка-бытавыя раманы і аповесці І. Мележа, А. Кулакоўскага, М. Лобана, А. Чарнышэвіча, апавяданні і нарысы В. Адамчыка, В. Палтаран і інш. Вяртанне да Коласа і Чорнага, да Гарэцкага і Гартнага загучала па-наватарску, аказалася рухам наперад.

Разгледзеўшы вядучыя тэндэнцыі і шматлікія праблемы сучаснай беларускай прозы ў плане традыцый і наватарства ў сувязі з агульнымі працэсамі літаратуры сацыялістычнага рэалізму, аўтар у раздзеле «А што там, далей?» «прагназіруе» шляхі яе далейшага развіцця, звяртае ўвагу на моцныя і слабыя яе бакі.

Для лепшых твораў сучаснай беларускай прозы характэрны пошук вялікай думкі, аналітычнай, філасофскай, «паэзіі думкі» аб жыцці і часе. Гэты пошук у літаратуры 70-х гадоў суправаджаецца далейшым паглыбленнем рэалізму і дакументалізму самога напісання.

У заключэнне аўтар падкрэслівае неабходнасць паяўлення ў сучаснай беларускай прозе сінтэтычна-паэтычнага твора аб цэлым народзе. Заяўка на набліжэнне да такой кнігі, у якой абагульняюцца і цэласная «думка народная» і «думка ўсеагульная», зроблена «Палескай хронікай» І. Мележа. На гэтым шляху беларускую прозу чакаюць новыя творчыя здабыткі і заваёвы.

Г. СІНЕНКА.

А. Адамовіч, «Гарызонты беларускай прозы», Масква, 1974 г.

ЛІСТОК ДАІ

# МЕСЯЧНІК БЯСПЕКІ РУХУ

Усё вастрэй становіцца праблема аўтамабільнага руху у сталіцы нашай рэспублікі. Імклівы рост аўтапарка намнога апярэджвае развіццё дарожнай сеткі. А калі ўлічыць яшчэ пастаянны рост насельніцтва, то лёгка ўявіць усю складанасць праблемы «аўтамабіль і чалавек».

Асаблівую трывогу выклікае цяперашні перыяд. Восень, пачатак навучальнага года ў школах і інстытутах. За час летніх канікулаў у загарадных піянерскіх лагерах дзеці некалькі адвыклі ад горада. У тэхнікумы і інстытуты прыйшло нямала людзей з сельскай мясцовасці з малаінтэнсіўным рухам. А значыць, дабавілася малавопытных пешаходаў.

Беручы ўсё гэта пад увагу, кожны год па ўсёй нашай краіне праводзяцца асеннія месячнікі бяспекі руху. У гэтым годзе ён праводзіцца з 1 па 31 кастрычніка.

Галоўная мэта гэтага мерапрыемства, як і ўсіх папярэдніх,—дабіцца з дапамогай прафілактычнай работы зніжэння колькасці дарожна-транспартных здарэнняў.

Месячнікі, якія праходзілі раней, разам са значным паляпшэннем работы транспартнікаў выявілі істотныя недахопы ў іх правядзенні на прамысловых прадпрыемствах, будоўлях, у вучэбных і навукова-даследчых установах.

Гарадская камісія па бяспецы руху выявіла, што работа па правядзенню месячніка ў многіх арганізацыях была абмежавана выхаваўчымі мерапрыемствамі толькі ў гаражах, а асноўная маса людзей — пешаходы — апынулася па-за сферай выхаваўчага ўздзеяння. Пытанні арганізацыі і правядзення месячніка не разглядаліся ў партыйных і камсамольскіх арганізацыях. На многіх прадпрыемствах работа ў рамках месячніка не была нават спланавана. Такі падыход да важнага дзяржаўнага мерапрыемства надалей недапушчальны.

Зараз паўсюдна на прадпрыемствах, у вучэбных установах, арганізацыях павінны быць распрацаваны і зацверджаны разнастайныя мерапрыемствы па забеспячэнню бяспекі руху, прычым галоўную ўвагу трэба звярнуць на самае шырокае азнаямленне рабочых, служачых, навучэнцаў з задачамі месячніка.

Ну, і самае галоўнае, што павінна забяспечыць поспех, — гэта дысцыпліна саміх удзельнікаў руху — пешаходаў і вадзіцеляў.

І. ХУДЗЕЕЎ, начальнік ДАІ г. Мінска.

«Белорусский университет» —орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар. Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА

Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. АТ 23522 Зак. № 1322.